Аляксандр Арлоў

старшы выкладчык кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін ДУА «Інстытут культуры Беларусі» (г. Мінск, Беларусь)

# Праблемы чытання ў сучаснай моладзі: вопыт шматсерыйнага даследавання

Апошнім часам апублікаваны вынікі навуковых даследаванняў па розных аспектах чытання. Актуальнымі з'яўляюцца праблемы чытання ў дзяцей, моладзі і дарослых, адносіны да друкаваных і віртуальных крыніц, выкарыстанне падчас навучання рэпрэзентатыўных крыніц інфармацыі, уплыў працэсу чытання на кагнітыўныя працэсы і інтэлект у розным узросце, праблемы авалодання чытаннем, праблема зместу школьнай праграмы па літаратуры [2; 3; 4; 5; 9].

Адшукаць даследаванні, дзе была б паказана дасведчанасць, начытанасць асоб юнацкага ўзросту ў галіне гуманітарных прадметаў, аказалася праблематычным. Наша даследаванне ставіла на мэце планаванне і правядзенне эксперыменту па вывучэнню дасведчанасці юнакоў і дзяўчат у гуманітарнай праблематыцы ў межах школьнай праграмы і гуманітарнай праграмы падчас навучання ў УВА. Першы этап даследавання атрымаў назву «Анкета "Чытанне: першая серыя"».



*Першая серыя* (пілатажнае даследаванне). *Інструментарый і выбарка.* Для стварэння анкеты за аснову былі ўзяты праграмы за ўвесь школьны курс па беларускай, рускай літаратуры, а таксама грамадазнаўчыя прадметы, з якіх выбарачна былі ўзяты прозвішчы літаратараў, філосафаў, навуковых дзеячаў [1; 6]. Да таго ў анкету ўвайшлі імёны аўтараў, вывучаныя падчас выкладання курса «Асновы псіхалогіі і педагогікі», у тым ліку літаратурна-мастацкі ілюстрацыйны матэрыял [7]. У выніку атрымалася пілотная версія анкеты, якая склалася з 22-х прозвішчаў (гл. табл. 1).

Пры апытанні студэнтаў 2, 3 і 4 курсаў некалькіх УВА г. Мінска былі створаны ўмовы, якія выключалі спісванне, карыстанне інтэрнэтам і мабільнай сувяззю. Удзел у апытанні быў добраахвотны, ананімны. Анкетаваныя атрымлівалі індывідуальны бланк з інструкцыяй, запаўнялі яго цягам 15—20 хвілін і здавалі даследчыку. Першая серыя даследавання праходзіла ў 2013—2014 навучальным годзе і ахапіла 101 чалавека (сярэдні ўзрост склаў 19,8 гадоў): у т.л. 29 дзяўчат (28,7 %) і 72 юнака (71,3 %).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сабраны матэрыял быў прааналізаваны шляхам кадзіравання адказаў і ўнясення лічбавых кодаў у табліцы (Excel). Для выраўноўвання выбаркі дастасаваны метад выдалення крайніх значэнняў. Далей быў выкананы колькасны і якасны аналіз даных.

Адказы рэспандэнтаў былі кадзіраваны наступным чынам: 2 балы прысвойваліся адказу, калі рэспандэнтам пададзена: перыяд жыцця аўтара, альбо нацыянальная прыналежнасць аўтара, назва твора (у сукупнасці — два і больш правільных ідэнтыфікатара); 1 бал, калі рэспандэнтам пададзена: толькі назва твора, альбо толькі род заняткаў, альбо толькі нацыянальная прыналежнасць аўтара. «Мінус адзін» бал прысвойваўся пры няправільным адказе. Адсутнасць адказа не пазначалася.

*Вынікі.* Па кожнаму рэспандэнту праведзена арыфметычнае сумаванне вынікаў і знойдзена сярэдняе значэнне па групе: яно склала 2,66 бала. Гэта азначае, што ў сярэднім адзін студэнт правільна і поўна вызначыў *аднаго* аўтара. Разбіванне адказаў па чвэрцях паказала: 25 % апытаных паказалі найлепшыя вынікі па выбарке (яны правільна азначылі ад двух да пяці аўтараў з анкеты). У той самы час 25 % не справіліся з заданнем (яны не змаглі поўна ідэнтыфікаваць *ніводнага* аўтара).



У табліцы пададзены спіс аўтараў паводле іх рэйтынга па адказах студэнтаў.

*Табліца*

Рэйтынг аўтараў па выніках ідэнтыфікацыі рэспандэнтамі ў час анкетавання

| Пазіцыя рэйтынга | № у анкеце | Аўтары[1] | Сума балаў па ўсёй выбарцы | Доля бала на аднаго апытанага |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | Блок А. А. | 97 | 0,91 |
| 2 | 6 | Быков В. В. | 76 | 0,71 |
| 3 | 4 | Бунин И. А. | 50 | 0,47 |
| 4 | 17 | Солженицын А. И. | 33 | 0,31 |
| 5 | 16 | Павлов И. П. | 23 | 0,21 |
| 6 | 11 | Леонгард К. | 14 | 0,13 |
| 7 | 3 | Белинский В. Г. | 11 | 0,10 |

[1] У анкеце напісанне прозвішчаў прапанавана на рускай мове дзеля нагляднасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заканчэнне табл.*

| Пазіцыя рэйтынга | № у анкеце | Аўтары[1] | Сума балаў па ўсёй выбарцы | Доля бала на аднаго апытанага |
|---|---|---|---|---|
| 8 | 13 | Макаренко А. С. | 7 | 0,07 |
| 9 | 1 | Айзенк Г. | 5 | 0,05 |
| 10 | 9 | Занковский А. Н. | 5 | 0,05 |
| 11 | 8 | Годфруа Ж. | 4 | 0,04 |
| 12 | 21 | Эриксон Э. | 4 | 0,04 |
| 13 | 18 | Сеченов И. М. | 3 | 0,03 |
| 14 | 7 | Векслер Д. | 2 | 0,02 |
| 15 | 10 | Кон И. С. | 2 | 0,02 |
| 16 | 12 | Майерс Д. | 2 | 0,02 |
| 17 | 15 | Олпорт Г. | 1 | 0,01 |
| 18 | 19 | Фромм Э. | 1 | 0,01 |
| 19 | 22 | Юнг К. Г. | 0 | 0,00 |
| 20 | 14 | Козлович А. | -1 | -0,01 |
| 21 | 20 | Эйдемиллер Э. | -1 | -0,01 |
| 22 | 5 | Буянов М. И. | -2 | -0,02 |



Як паказала даследаванне, найбольш пазнавальнымі для студэнтаў з спіса аказаліся: пісьменнікі — беларускі В. Быкаў, рускія А. Блок, І. Бунін, В. Бялінскі; педагог А. Макаранка, вучоны-фізіёлаг І. Паўлаў, нямецкі псіхолаг К. Леангард. Астатнія аўтары і дзеячы паводле долі бала, атрыманай у сярэднім кожным апытаным за правільны адказ, знаходзяцца *за межамі статыстычнага ўзроўню значнасці*, а адпаведна іх пазнавальнасць у выбарцы, можна лічыць, *не адбылася*.

Галоўная выснова даследавання:

узровень дасведчанасці ў сярэднім па выбарцы выяўлены даволі нізкі;

абраны інструментарый падыходзіць для прыблізнай ацэнкі ўзроўню дасведчанасці ў канкрэтнай прадметнай сферы і патрабуе ўдасканалення;

метад анкетавання з алічбоўкай вынікаў прыдатны для статыстычнай апрацоўкі і колькасна-якаснага аналізу даных.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Другая серыя* (эксперымент-канстатаванне). *Інструментарый і выбарка.* На другім этапе нашага даследавання пілатажны варыянт анкеты быў зменены і дапоўнены. Акрамя задання тыпу А (вызначэнне аўтараў і дзеячаў), рэспандэнтам было прапанавана заданне В, дзе патрабавалася вызначыць творы, г. зн. падаць прозвішча аўтара паводле прапанаваных назваў. Заданне А ўтрымлівала 25 прозвішчаў, В — 25 назваў твораў.

Працэдура і ўмовы апытання, кадзіраванне адказаў і іх апрацоўка былі аналагічнымі, як і ў першай серыі даследавання. Асноўны матэрыял быў сабраны ў 2014—2015 навучальным годзе ў УВА г. Мінск.

У другой серыі даследавання ўдзельнічалі 125 чалавек юнацкага ўзросту (у сярэднім 19,7 год), у т. л. 80 юнакоў (64 %) і 45 дзяўчат (36 %).

*Папярэднія вынікі.* Па заданню А студэнты атрымалі ў сярэднім 4,53 бала, г.зн. яны пазналі *дзве* асобы з прапанаванага спіса 25-ці аўтараў. Пазнаванне назваў твораў у заданні Б прайшло крыху больш паспяхова: у сярэднім 5,72 бала, г.зн. расшыфраванымі праз кожнага апытанага сталі 2—3 назвы з 25 твораў са школьнай праграмы і з праграмы УВА.



*Галоўная выснова* другой серыі даследавання, праведзенага з дапамогай удасканаленага, пашыранага інструментарыя: узровень дасведчанасці ў сярэднім па выбарцы выяўлены *даволі нізкі*. Такім чынам пацвярджаюцца вынікі пілатажнага даследавання: пазнавальнасць аўтараў у першай серыі склала ў сярэднім 6,0 %, а ў другой пазнавальнасць аўтараў — 9,0 %, твораў — 11,4 %. Калі ўявіць мяжу здавальняючай пазнавальнасці хаця б у 30 % — усе выяўленыя паказчыкі менш за яе ў 2,6—5 разоў.

Выяўлены стан можа быць выкліканы рознымі фактарамі: найменшымі падаюцца ўздзеянне памеру і збалансаванасці выбаркі, а таксама падбору матэрыялу для анкеты. Найбольш верагодныя фактары трэба шукаць у змесце праграм адпаведных дысцыплін, у метадах выкладання гэтага зместу, а таксама ў спосабах актывацыі і матывавання навучэнцаў і студэнтаў.

*Трэцяя серыя* (эксперымент «спачатку» і «пасля»). Працягам другой серыі даследавання, праведзенага ў пачатку семестра, з'явілася паўторнае даследаванне напрыканцы семестра, якое было праведзена па той самай анкеце і ў тых самых групах. Задачай трэцяй серыі было выявіць дынаміку назапашвання ведаў студэнтамі на працягу семестра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вага навучання. Асноўным зместам гуманітарнага навучання, якое вялося ў такім семестры, была філасофія, псіхалогія і педагогіка (інтэграваны модуль «Філасофія»). Вынікі трэцяй серыі эксперыменту апрацоўваюцца.

Больш дэталёвы каментарый да вынікаў другой і трэцяй серый даследавання з'явіцца пазней у друку і на старонцы аўтара ў сетцы інтэрнэт [8].

*Перспектывы даследаванняў.* На падставе вопыту вывучэння дасведчанасці моладзі ў сферы гуманітарных ведаў лічым мэтазгодным дадаць да частак A і B анкеты часткі C і D.

У частцы C рэспандэнтам будзе прапанавана вызначыць тэрміны, па дадзенаму азначэнню знайсці паняцце, адказаць на складаныя пытанні сацыяльна-гуманітарнай накіраванасці.

Частка D будзе даследаваць веданне рэспандэнтам сюжэту, зместу або галоўнай думкі аднаго з твораў беларускай (а таксама рускай і замежнай) сучаснай і класічнай літаратуры.



Такая комплексная анкета можа паслужыць больш надзейным сродкам для педагагічнай дыягностыкі сацыяльна-гуманітарнай дасведчанасці студэнтаў і вучняў старэйшых класаў, дапаможа планаваць у канкрэтным кірунку работу з навучэнцамі пры выкладанні грамадазнаўчых навук, філасофіі, эканомікі, псіхалогіі, культуралогіі.

Этапы і агульныя вынікі даследавання павінны высветліць агульную праблему дасведчанасці, эрудыцыі будучых спецыялістаў розных профіляў навучання, вызначыць слабыя месцы зместу і методыкі выкладання гуманітарных прадметаў. Усё гэта, урэшце, павінна паслужыць нагодай для ўдасканалення зместу і формы навучальнага і выхаваўчага працэсу як у школе, так і ў УВА.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Беларуская літаратура : кароткі змест і аналіз твораў : школьны курс / склад. А. А. Тарайковіч. — Мінск : Юніпрэс, 2010. — 634 с.

2. *Карпова*, *Н. Л.* Исследования чтения и грамотности, выполненные в Психологическом институте РАО за 100 лет / Н. Л. Карпова, Г. Г. Граник, М. К. Кабардов // Вопросы психологии : науч. журнал. — 2014. — № 4. — С. 72—82.

3. Книги и их читатели : как им встретиться? [Электронный ресурс]. — 2014. — Режим доступа : http://wciom.ru/index.php?id=236&uid=114974. — Дата доступа : 01.10.2015.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Мартысевіч*, *М*. Гэта нам не задавалі [Электронный ресурс]. — 2011. — Режим доступа : http://prajdzisvet.org/critique/32-heta-nam-nie-zadavali.html. — Дата доступа : 01.10.2015.

5. *Невзоров*, *А*. У русской литературы закончился срок годности [Электронный ресурс]. — 2014. — Режим доступа : https://snob.ru/profile/20736/blog/76791. — Дата доступа : 01.10.2015.

6. *Нефагина*, *Г. Л*. Русская литература : школьный курс в кратком изложении : пособие для поступающих в вузы / Г. Л. Нефагина. — Минск : ТетраСистемс, 2011. — 416 с.

7. Орлов, *А. Л*. Опыт преподавания основ психологии и педагогики с использованием литературно-художественных средств / А. Л. Орлов // Современные технологии и образование : проблемы, идеи, перспективы : материалы Междунар. науч.-практ. конф. БНТУ. (Минск, 27—28 ноября 2014 г.). — Минск : БНТУ, 2014. — С. 106—111.

8. Орлов, А. Л. [статьи] [Электронный ресурс] / А. Л. Орлов. — 2015. — Режим доступа : http://samlib.ru/editors/o/orlow_a_l/. — Дата доступа : 01.10.2015.

9. *Пол*, Э. Книги делают нас умнее и добрее (Annie Murphy PAUL, Reading Literature Makes Us Smarter and Nicer, «Time», USA) / пер. с англ. [Электронный ресурс]. — 2013. — Режим доступа : http://inosmi.ru/world/20130612/209952577.html. — Дата доступа : 01.10.2015.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ